Мальчэўскі, Я. С. Крыніцы па гісторыі дзяржаўнай патэнтавай службы Рэспублікі Беларусь / Я. С. Мальчэўскі // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны : навук. зб. Вып. 7 / рэдкал. : С. М. Ходзін (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БДУ, 2012. — С. 90-98.

**Я. С. МАЛЬЧЭЎСКІ**

# КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАТЭНТАВАЙ СЛУЖБЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Дзяржаўная патэнтавая служба ўяўляе сабой сукупнасць дзяржаўных органаў і арганізацый, якія ажыццяўляюць функцыі па ахове прамысловай уласнасці. Ядром дзяржаўнай патэнтавай службы Рэспублікі Беларусь з’яўляецца Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці. Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці пры Дзяржаўным камітэце па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь непасрэдна забяспечвае ахову правоў на вынікі інтэлектуальнай дзейнасці, ажыццяўляе функцыі патэнтавага органа і з’яўляецца ключавым суб’ектам інфраструктуры нацыянальнай патэнтавай сістэмы. Дзяржаўная служба інтэлектуальнай уласнасці ў цэлым і патэнтавы орган, у прыватнасці, прайшлі даволі складаны і насычаны падзеямі шлях развіцця. Разгляд працэсаў станаўлення і развіцця органаў і арганізацый дзяржаўнай службы інтэлектуальнай уласнасці (асабліва патэнтавага органа) дапаможа не толькі зразумець, якім чынам адбывалася іх фарміраванне ў сучасным выглядзе, але і вызначыць тэндэнцыі далейшага развіцця сістэмы інтэлектуальнай уласнасці Беларусі.

Разам з тым пытанні станаўлення і функцыянавання дзяржаўнай патэнтавай службы ў Рэспубліцы Беларусь з’яўляюцца даследаванымі ў недастатковай ступені.

Дапамагчы ў даследаванні працэсаў станаўлення і развіцця дзяржаўнай патэнтавай службы Рэспублікі Беларусь зможа дэталёвае вывучэнне крыніц па гісторыі ўтварэння і функцыянавання патэнтавага органа і іншых органаў (арганізацый) дзяржаўнай патэнтавай службы.

**Мальчэўскі Яўген Сяргеевіч** — аспірант кафедры крыніцазнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, магістр гістарычных навук.

Цікавасць для даследчыка ўяўляюць міжнародныя дамовы аб ахове інтэлектуальнай уласнасці. Да асноўных міжнародных дамоў, удзельніцай якіх з'яўляецца Рэспубліка Беларусь, можна аднесці Парыжскую канвенцыю аб ахове прамысловай уласнасці (далей — Парыжская канвенцыя), Мадрыдскае пагадненне аб міжнароднай рэгістрацыі знакаў і Дамову аб патэнтавай кааперацыі. У адпаведнасці з артыкулам 12 Парыжскай канвенцыі, у якой Рэспубліка Беларусь удзельнічае з 25.12.1991, кожная краіна Саюза па ахове прамысловай уласнасці (утвораны паводле артыкула 1 Парыжскай канвенцыі) абавязваецца стварыць цэнтральнае сховішча для азнаямлення грамадскасці з патэнтамі на вынаходствы, карыснымі мадэлямі, прамысловымі ўзорамі і таварнымі знакамі. Паводле Парыжскай канвенцыі вызначаецца склад аб'ектаў аховы прамысловай уласнасці. Таксама адзначаецца, што прамысловая ўласнасць разумеецца ў самым шырокім сэнсе і распаўсюджваецца не толькі на прамысловасць і гандаль, але і на іншыя галіны вытворчасці [1]. У адпаведнасці з Мадрыдскім пагадненнем аб міжнароднай рэгістрацыі знакаў і Дамовай аб патэнтавай кааперацыі вызначаюцца функцыі ведамства, якое атрымлівае заяўкі па адпаведных міжнародных працэдурах рэгістрацыі аб'ектаў прамысловай уласнасці [2; 3].

Аднымі з найбольш важных крыніц інфармацыі аб станаўленні, развіцці, арганізацыі і асаблівасцях функцыянавання дзяржаўнай службы інтэлектуальнай уласнасці з'яўляюцца нарматыўныя дакументы Рэспублікі Беларусь, якія рэгулявалі (рэгулююць) адносіны з нагоды стварэння, аховы і выкарыстання вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці.

Асноўным нарматыўным прававым актам у сферы інтэлектуальнай уласнасці з'яўляецца Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь (далей — ГК), які быў прыняты ў 1998 г. У ГК змяшчаюцца палажэнні, якія ўводзяць і раскрываюць сутнасць паняцця, структуры інтэлектуальнай уласнасці і раскрываюць сутнасць яе аб'ектаў, закладваючы, такім чынам, падмурак сістэмы інтэлектуальнай уласнасці Беларусі [7].

Пасля ўтварэння патэнтавага органа першачарговая ўвага была нададзена распрацоўцы нарматыўнай базы па ахове прамысловай уласнасці. Законамі «Аб патэнтах на вынаходствы» ад 05.02.1993, «Аб патэнтах на прамысловыя ўзоры» ад 05.02.1993 і «Аб патэнтах на вынаходствы і карысныя мадэлі» ад 08.07.1997, якія ўжо спынілі сваё дзеянне, упершыню ў Рэспубліцы Беларусь была зацверджана прававая ахова вынаходстваў, прамысловых узораў і карысных мадэляў, вызначаны функцыі патэнтавага органа па забеспячэнні аховы дадзеных аб'ектаў прамысловай уласнасці [4; 5; 6].

Практыка ўжывання гэтых заканадаўчых дакументаў выявіла шэраг прабелаў і недакладнасцей у прававым рэгуляванні па асобных пытаннях і паказала накірункі для ўдасканалення патэнтавага заканадаўства. У свеце з'явіліся новыя міжнародныя стандарты ў вобласці інтэлектуальнай уласнасці, замацаваныя ў міжнародных дамовах, што таксама запатрабавала ўнесці карэктывы ў дадзеныя Законы. Акрамя таго, было прынята рашэнне аб'яднаць прававое рэгуляванне адносін у вобласці аховы вынаходстваў, карысных мадэляў, прамысловых узораў у адзіным заканадаўчым дакуменце.

Законы Рэспублікі Беларусь «Аб таварных знаках і знаках абслугоўвання» ад 05.02.1993, «Аб патэнтах на сарты раслін» ад 13.04.1995, «Аб прававой ахове тапалогій інтэгральных мікрасхем» ад 07.12.1998, «Аб геаграфічных указаннях» ад 17.07.2002, «Аб патэнтах на вынаходствы, карысныя мадэлі, прамысловыя ўзоры» ад 16.12.2002 рэгулююць адносіны з нагоды стварэння, аховы і выкарыстання асобных аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці [8; 9; 10; 11; 12]. Разам з тым гэтымі законамі вызначаюцца функцыі патэнтавага органа па афармленні дзяржаўнай рэгістрацыі адпаведных аб'ектаў прамысловай уласнасці. Названыя законы змяшчаюць палажэнні, якія вызначаюць змест працэсу афармлення дзяржаўнай рэгістрацыі, умовы выдачы ахоўных дакументаў і склад дакументаў заяўкі на атрыманне ахоўнага дакумента на адпаведныя аб'екты прамысловай уласнасці.

Гэтыя ж палажэнні раскрываюцца і дэталізуюцца ў падзаконных актах: Палажэнні аб парадку рэгістрацыі таварнага знака і знака абслугоўвання, Правілах складання, падачы і папярэдняй экспертызы заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства, Правілах складання, падачы і разгляду заяўкі на выдачу патэнта на карысную мадэль, Правілах складання, падачы і разгляду заяўкі на выдачу патэнта на прамысловы ўзор і некаторых іншых [13; 14; 15; 16]. У Палажэнні аб афіцыйных выданнях Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці, зацверджаным пастановай Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях ад 26.09.2005 № 12, вызначаюцца наменклатура і структура афіцыйных выданняў патэнтавага органа, а таксама склад звестак, якія ў іх публікуюцца [17].

Асобную групу крыніц складаюць прававыя акты Рэспублікі Беларусь, у адпаведнасці з якімі адбываліся ўтварэнне і рэарганізацыі органаў і ўстаноў дзяржаўнай службы інтэлектуальнай уласнасці. Да іх адносіцца пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб утварэнні Дзяржаўнага патэнтавага ведамства пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь» ад 09.04.1992 № 199, паводле якой упершыню быў утвораны

орган дзяржаўнага кіравання ў сферы прамысловай уласнасці [18]. Указы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб змене структуры цэнтральных органаў кіравання Рэспублікі Беларусь» ад 23.09.1994 № 122, «Аб сістэме рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, падначаленых Ураду Рэспублікі Беларусь» ад 11.01.1997 № 30, «Аб удасканаленні сістэмы рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых дзяржаўных арганізацый, падначаленых Ураду Рэспублікі Беларусь» ад 24.09.2001 № 516 карэнным чынам змянялі структуру сістэмы рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і іншых арганізацый, падведамасных Ураду Рэспублікі Беларусь [19; 20; 21]. У адпаведнасці з дадзенымі указамі патэнтавы орган быў некалькі разоў рэарганізаваны. Падчас пераўтварэнняў патэнтавага ведамства статус яго істотна змяняўся, што, у сваю чаргу, цягнула адпаведныя змены кампетэнцыі.

Важнымі крыніцамі па гісторыі патэнтавай службы з'яўляюцца нарматыўныя прававыя акты, якія рэгламентавалі дзейнасць патэнтавага органа на розных этапах развіцця дзяржаўнай службы інтэлектуальнай уласнасці. Да гэтых дакументаў адносяцца: пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Пытанні Дзяржаўнага патэнтавага ведамства пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь» ад 31.07.1992 № 472, Палажэнне аб Дзяржаўным патэнтавым ведамстве, зацверджанае загадам Міністра адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь ад 12.12.1995 № 461, Палажэнне аб Дзяржаўным патэнтавым камітэце Рэспублікі Беларусь, зацверджанае пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 11.04.1997 № 322 [22; 23; 24].

У цяперашні час дзейнасць патэнтавага органа рэгламентуецца статутам Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці і Палажэннем аб Нацыянальным цэнтры інтэлектуальнай уласнасці. У згаданых дакументах вызначаны асноўныя задачы, функцыі, правы Нацыянальнага цэнтра.

Дзейнасць рэспубліканскіх дзяржаўных устаноў рэспубліканскага ўзроўню, як правіла, рэгламентуецца статутамі, зацверджанымі адпаведнымі рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання. Статут Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці быў зацверджаны загадам Камітэта па навуцы пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30.11.2001 № 32, адразу пасля ўтварэння Нацыянальнага цэнтра. Паводле рашэння Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта ад 18.12.2001 № 1745 Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці і яго статут былі зарэгістраваны ў Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў (АДР 190310695) [25].

Пазней пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 31.05.2004 № 641 было зацверджана Палажэнне аб Нацыянальным цэнтры інтэлектуальнай уласнасці [26]. Палажэнне было распрацавана для павышэння афіцыйнага статуса патэнтавага органа. Варта адзначыць, што Палажэнне як арганізацыйны дакумент больш характэрны для рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання. Аднак Статут Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці не страціў сілу з прыняццем Палажэння і Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці не выключылі з Адзінага дзяржаўнага рэгістра юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў.

Склалася даволі цікавая сітуацыя, калі адначасова для патэнтавага органа дзейнічаюць два рознаўзроўневых арганізацыйных дакументы, якія рэгламентуюць яго дзейнасць. З улікам вышэйадзначанага можна зрабіць выснову, што з моманту зацвярджэння Палажэння Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці займае прамежкавае месца паміж рэспубліканскім органам дзяржаўнай улады і дзяржаўнай установай рэспубліканскага значэння.

Важнае значэнне для даследавання гісторыі патэнтавага органа мае выкарыстанне матэрыялаў архіва Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці. Перш за ўсё ўвагу даследчыка прыцягваюць дакументы аб арганізацыйнай, выканаўчай, распарадчай і фінансавай дзейнасці патэнтавага органа. Варта адзначыць, што арганізацыйна-распарадчыя, планава-справаздачныя і фінансавыя дакументы, якія ўтварыліся падчас дзейнасці патэнтавага органа ад моманту яго стварэння, цалкам знаходзяцца на ведамасным захоўванні ў архіве Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці. Дадзеныя катэгорыі дакументаў уключаны ў вопіс № 1-УД (50 спраў).

У прыватнасці, вопіс змяшчае загады Старшыні Белдзяржпатэнта (генеральнага дырэктара Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці) па асноўнай дзейнасці, штатныя расклады патэнтавага органа, гадавыя справаздачы аб яго фінансава-гаспадарчай дзейнасці і тлумачальныя запіскі да іх, правілы, палажэнні, указанні, растлумачэнні, пералікі, распрацаваныя патэнтавым органам, і матэрыялы па іх распрацоўцы. Правілы, палажэнні, указанні, растлумачэнні, пералікі ўяўляюць сабой арыгіналы нарматыўных прававых актаў Рэспублікі Беларусь, метадычных дакументаў, зацверджаных загадамі і пастановамі Белдзяржпатэнта.

Вялікую цікавасць для даследчыка ўяўляюць загады патэнтавага органа па асноўнай дзейнасці. Трэба адзначыць, што дакументы гэтай катэгорыі былі выдадзены на аснове нарматыўных прававых актаў Рэспублікі

Беларусь у межах ажыццяўлення выканаўчай і распарадчай дзейнасці патэнтавым органам. Прывядзём некалькі прыкладаў загадаў патэнтавага органа, у якіх знайшлі адлюстраванне пытанні станаўлення і развіцця механізмаў і інфраструктуры нацыянальнай патэнтавай сістэмы.

Загад Дзяржаўнага патэнтавага ведамства пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб парадку прыёму заявак і афармленні ахоўных дакументаў на аб’екты прамысловай уласнасці» ад 23.07.1993 № 11 упершыню ў гісторыі незалежнай Беларусі вызначыў парадак прыёму заявак на вынаходствы, таварныя знакі і прамысловыя ўзоры, правядзення экспертызы і выдачы ахоўных дакументаў Рэспублікі Беларусь, закладваючы падмурак практычнага механізму нацыянальнай патэнтавай сістэмы [27]. Загадам Дзяржаўнага патэнтавага ведамства пры Міністэрстве адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь «Аб стварэнні Апеляцыйнага савета патэнтавай экспертызы і экспертызы па таварных знаках Белдзяржпатэнта» ад 17.11.1995 № 45а быў утвораны Апеляцыйны савет пры Белдзяржпатэнце, вызначаны яго функцыі, правы па разглядзе скарг фізічных і юрыдычных асоб на рашэнне экспертызы патэнтавага органа ў адносінах заявак на аб’екты прамысловай уласнасці і пярэчанняў фізічных і юрыдычных асоб супраць выдачы патэнтаў, сведчанняў і рэгістрацый аб’ектаў прамысловай уласнасці [28]. У адпаведнасці з загадам Дзяржаўнага патэнтавага камітэта Рэспублікі Беларусь «Аб перарэгістрацыі ўстаноўчых дакументаў» ад 13.10.1999 № 35 падведамасная арганізацыя патэнтавага органа Дзяржаўнае прадпрыемства «Вучэбна-даследчы цэнтр прамысловай уласнасці» была рэарганізавана ў Вучэбна-даследчае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства інтэлектуальнай уласнасці «РУПІУ» [29].

Гадавыя справаздачы патэнтавага органа маюць асаблівае значэнне ў якасці крыніцы па яго гісторыі. Дадзеныя дакументы з’яўляюцца афіцыйнымі выданнямі патэнтавага органа, асноўнай мэтай якіх выступае азнаямленне грамадскасці з дзейнасцю патэнтавага органа і станам сістэмы інтэлектуальнай уласнасці Беларусі ў цэлым за каляндарны год. Гадавыя справаздачы змяшчаюць звесткі аб падрыхтоўцы і прыняцці нарматыўных прававых актаў у сферы інтэлектуальнай уласнасці, колькасці заявак на аб’екты прамысловай уласнасці, пададзеных у патэнтавы орган, колькасці ахоўных дакументаў, выдадзеных патэнтавым органам, інфармацыйна-метадалагічным забеспячэнні сістэмы інтэлектуальнай уласнасці і інш. Улічваючы тое, што выданне гадавых справаздач пачалося літаральна з часу стварэння патэнтавага органа (першая справаздача была падрыхтавана за 1993 г. і апублікавана ў 1994 г.) [30] і працягваецца

па цяперашні час, у гадавых справаздачах ахоплены амаль увесь перыяд існавання патэнтавага органа. Справаздача за 2002 г. утрымлівае невялікі гістарычны агляд развіцця патэнтавага органа Рэспублікі Беларусь, прысвечаны дзесяцігоддзю яго ўтварэння [31]. Разам з тым неабходна канстатаваць вялікую колькасць памылак і недакладнасцей, асабліва ў лічбавых дадзеных гадавых справаздач.

На аснове аналізу актаў заканадаўства ў сферах інтэлектуальнай уласнасці і дзяржаўнага будаўніцтва і дакументаў архіўнага фонда Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці можна выдзеліць наступныя асноўныя віды крыніц па гісторыі дзяржаўнай патэнтавай службы Беларусі: 1. Міжнародныя дамовы, у якіх Рэспубліка Беларусь удзельнічае. 2. Заканадаўчыя дакументы Рэспублікі Беларусь. 3. Матэрыялы справаводства патэнтавага органа. 4. Афіцыйныя выданні патэнтавага органа.

## ЛІТАРАТУРА

1. Парижская конвенция по охране промышленной собственности // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2010.

2. Мадридское соглашение о международной регистрации знаков // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2010.

3. Договор о патентной кооперации («PCT») // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2010.

4. Закон Республики Беларусь «О патентах на изобретения» от 05.02.1993 // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2010.

5. Закон Республики Беларусь «О патентах на промышленные образцы» от 05.02.1993 // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2010.

6. Закон Республики Беларусь «О патентах на изобретения и полезные модели» от 08.07.1997 // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2010.

7. Гражданский кодекс Республики Беларусь // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2010.

8. Закон Республики Беларусь «О патентах на изобретения, полезные модели, промышленные образцы» от 16.12.2002 // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2010.

9. Закон Республики Беларусь «О патентах на сорта растений» от 13.04.1995 // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2010.

10. Закон Республики Беларусь «О товарных знаках и знаках обслуживания» от 05.02.1993 // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2010.

11. Закон Республики Беларусь «О географических указаниях» от 17.07.2002 // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2010.

12. Закон Республики Беларусь «О правовой охране топологий интегральных микросхем» от 07.12.1998 // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2010.

13. Положение о порядке регистрации товарного знака и знака обслуживания (утвержд. постановлением Совета Министров Респ. Беларусь от 28.12.2009 № 1719) // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2010.

14. Правила составления, подачи и предварительной экспертизы заявки на выдачу патента на изобретение (утвержд. постановлением Комитета по науке и технологиям при Совете Министров Респ. Беларусь от 16.06.2003 № 19 (ред. от 08.02.2006)) // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2010.

15. Правила составления, подачи и рассмотрения заявки на выдачу патента на полезную модель (утвержд. постановлением Комитета по науке и технологиям при Совете Министров Респ. Беларусь от 16.06.2003 № 17 (ред. от 05.05.2004)) // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2010.

16. Правила составления, подачи и рассмотрения заявки на выдачу патента на промышленный образец (утвержд. постановлением Комитета по науке и технологиям при Совете Министров Респ. Беларусь от 16.06.2003 № 18 (ред. от 08.02.2006)) // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2010.

17. Положение об официальных изданиях Национального центра интеллектуальной собственности (утвержд. постановлением Государственного комитета по науке и технологиям Респ. Беларусь от 26.09.2005 № 12) // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2010.

18. Постановление Совета Министров Республики Беларусь «Об образовании Государственного патентного ведомства при Совете Министров Республики Беларусь» от 09.04.1992 № 199 // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2010.

19. Указ Президента Республики Беларусь «Об изменении структуры центральных органов управления Республики Беларусь» от 23.09.1994 № 122 // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2010.

20. Указ Президента Республики Беларусь «О системе республиканских органов государственного управления, подчиненных Правительству Республики Беларусь» от 11.01.1997 № 30 // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2010.

21. Указ Президента Республики Беларусь «О совершенствовании системы республиканских органов государственного управления и иных государственных организаций, подчиненных Правительству Республики Беларусь» от 24.09.2001 № 516 // Консультант

плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2010.

22. Постановление Совета Министров Республики Беларусь «Вопросы Государственного патентного ведомства при Совете Министров Республики Беларусь» от 31.07.1992 № 472 // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2010.

23. Положение о Государственном патентном ведомстве (утвержд. приказом Министра образования и науки Республики Беларусь от 12.12.1995 № 461) // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2010.

24. Положение о Государственном патентном комитете Республики Беларусь (утвержд. постановлением Совета Министров Респ. Беларусь от 11.04.1997 № 322) // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2010.

25. Архіў Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці. Воп. 1-УД. Спр. 48.

26. Положение о Национальном центре интеллектуальной собственности (утвержд. постановлением Совета Министров Респ. Беларусь от 31.05.2004 № 641) // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. Минск, 2010.

27. Архіў Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці. Воп. 1-УД. Спр. 5.

28. Архіў Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці. Воп. 1-УД. Спр. 19.

29. Архіў Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці. Воп. 1-УД. Спр. 38.

30. Государственное патентное ведомство Республики Беларусь: Годовой отчет 1993. Минск : Белгоспатент, 1994.

31. Национальный центр интеллектуальной собственности: Годовой отчет 2002. Минск : НЦИС, 2003.

## РЕЗЮМЕ. SUMMARY

Статья посвящена исследованию источников по истории государственной патентной службы Республики Беларусь. Анализируются состав и содержание международных договоров и нормативных правовых документов Беларуси в сферах интеллектуальной собственности и государственного строительства. Дается характеристика документов Архивного фонда Национального центра интеллектуальной собственности и официальных изданий патентного органа, определяется их научная ценность как исторического источника. В рамках исследования выделяются основные виды источников по истории государственной патентной службы Республики Беларусь.

The Yauhen Malcheuski's article is dedicated to the study of sources on the history of the Belarusian state patent service. The structure and information content of international treaties and legislation on intellectual property of Belarus are analyzed. The author characterizes archival records of the National center of intellectual property and official publications of the patent office and defines their historical value. Within the framework of the study the main kinds of the sources on the history of the Belarusian state patent service are defined.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 25 чэрвеня 2010 г.